ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
26
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 11(1532)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

тэлетайп

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

НА ВЕЧАРЫ

працоўнай славы, дзе сустрэліся байцы студэнцкіх атрадаў БДУ імя У. І. Леніна, былі падведзены вынікі працоўнага семестра 1986 года. Лепшым байцам і атрадам сакратар камітэта камсамола А. Жук уручыў узнагароды. Пераходны Чырвоны сцяг атрымаў зводны атрад юрыдычнага факультэта, які заняў першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве паміж зводнымі атрадамі універсітэта. Узнагароджаны атрад «Белая Русь» — пераможца сярод атрадаў бязвыплатнай працы, «Аэліта» — пераможца сярод небудаўнічых атрадаў.

За актыўны ўдзел у працоўным семестры адзначаны Т. Варабей, А. Пухаў, А. Дземяшкевіч, І. Цярэнцьева, Г. Сітніца, Т. Мацкевіч, В. Бойка.

На вечары прысутнічалі госці — парторг Стаўрапольскага саўгаса «Цішчанскі» І. Салянік і аграном-агароднік А. Стральцова, якія расказалі пра тое, як у іх краі паважаюць студэнцкія рукі, запрасілі працаваць да сябе зноў.

Н. БАХІР,
студэнтка факультэта журналістыкі.

НАВІНКІ

выдавецтва «Універсітэцкае» прапаноўвае ўвазе студэнтаў і выкладчыкаў Цэнтральны кніжны магазін: В. В. Бянькоўскі, Л. В. Лойка. Сусветная сацыялістычная сістэма. Даты, факты, каментарыі; М. І. Жукаў. Праблемы свядомасці; І. І. Сярова. Культура міжнародных зносін; Л. М. Шнеерсон. Магістральны напрамак — усеагульны мір; Вілейска-Мінская водная сістэма.

Ж. КРУГЛІКАВА.

«СТУДЭНЦКАЯ ВЯСНА-87»

набліжаецца. Агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці універсітэта пройдзе з 1 красавіка па 17 мая. Пачне яго факультэт прыкладной матэматыкі.

А. САЎЧЫК.

ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ

«Палітыкус» праводзіць 30 сакавіка чарговае пасяджэнне. Тэма — «Філіпіны сёння». У пасяджэнні прымуць удзел грамадзяне Філіпін — студэнты ВНУ г. Мінска.

А. САВІЧ.

ФАРМІРУЕЦЦА

ідэалагічны атрад бязвыплатнай працы па рабоце са слухачамі курсаў па вывучэнню рускай мовы для замежных грамадзян з Італіі, Англіі, Швецыі, Данії. Байцы гэтага атрада будуць вызвалены ад сельгасработ увосень. Заявы падаваць у пакой № 306 галоўнага корпуса.

А. САМУЙЛІЧ.

мы — інтэрнацыяналісты

У НАШЫМ універсітэце вучыцца сапраўды інтэрнацыянальная сям'я. І вельмі прыемна, што юнакоў і дзяўчат з іншых краін свету хвалюе жыццё студэнтаў. Многія нашы замежныя сябры прымаюць актыўны ўдзел у прафсаюзным і камсамольскім жыцці, актыўна працуюць у сваіх зямляцтвах. У БДУ 13 замежных студэнтаў атрымліваюць стыпендыі Камітэта маладзёжных арганізацый (КМА) і 10 — стыпендыі ВЦСПС.

Стыпендыяты КМА і ВЦСПС — людзі зацікаўленыя. У гэтым яшчэ раз можна было пераканацца на сустрэчы, што адбылася ў студэнцкім кафэ «Гаўдэамус». Замежныя студэнты, прафсаюзныя і камсамольскія актывісты універсітэта сустрэліся з дэлегатам XX з'езда ВЛКСМ сакратаром камітэта камсамола Белдзяржуніверсітэта Аляксандрам Жуком і дэлегатам XVIII з'езда прафсаюзаў СССР студэнтам II курса факультэта журналістыкі Сяргеем Зайцам.

Т. ХУДОБА,
студэнтка факультэта журналістыкі.
Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.



САМАКІРАВАННЕ: АПТЫМІСТЫ І ПЕСІМІСТЫ

кожнага датычыць

Не памылюся, калі скажу, што студэнты любяць слова «дэмакратыя» і ўсё, што з ім непасрэдна звязана. Скажам, студэнцкае самакіраванне. Яно выступае актыўнай формай праяўлення дэмакратызацыі сістэмы навучання, таму што пашырае правы студэнцкіх калектываў у галіне арганізацыі навучальнага працэсу, навукова-даследчай работы, прадукцыйнай працы.

ЗДАЕЦЦА, усё добра: правы студэнты маюць, і можна смела імі карыстацца. Напрыклад, ставіць перад адміністрацыяй факультэта пытанне пра замену выкладчыка, які праводзіць заняткі не на належным узроўні. Ці адпускаць студэнтаў з заняткаў па іх заявах.

Але студэнцкае самакіраванне адначасова павышае адказнасць студэнтаў за рэзультаты навучання і грамадскай дзейнасці. І гэта, на жаль, спалохала некаторых студэнтаў. Нават на механіка-матэматычным факультэце, дзе ўжо даволі працяглы час практыкуецца студэнцкае самакіраванне. Такую думку выказала Іна Краўчанка, сакратар камітэта камсамола ММФ:

— Трэба заўсёды памятаць, што сістэма самакіравання патрабуе ад кожнага студэнта яшчэ большай адказнасці. А вось гэтага нам часам не хапае. Напрыклад, ВВК мае права адпускаць студэнтаў з заняткаў па іх заявах. Значыць, ёй даверылі кантроль за наведваннем заняткаў. Але не ўсе камсоргі і старасты гэта разумеюць. Многія старасты не звяртаюць ніякай увагі на пропускі, а на камсамольскіх сходах пытанне аб наведванні заняткаў старэюцца абмінуць. Затое ў размовах са студэнтамі часта можна пачуць наступнае: «Чаму нам трэба хадзіць на лекцыю, якая чытаецца так, што яе ніхто не слухае?» Згодна. Але каб вырашыць гэта пытанне, створана студэнцкая метадычная камісія. Давайце самі дапаможам выкладчыкам высветліць, што неабходна змяніць. Чаму ж маўчаць члены метадычнай камісіі на сваіх пасяджэннях? Чаму не высвятляюць погляды групы, патока?

Вось некаторыя меркаванні саміх студэнтаў:

«Я лічу, што самакіраванне можна ўкараняць толькі тады, калі навучымся кіраваць. А гэтага ў нас яшчэ няма!»

«Я нават не ведаю, у чым яно заключаецца».

«Нам дадзены правы, але як імі карыстацца?»

«Мы недастаткова інфармаваны аб усіх справах факультэта».

«Часта ўмешваюцца выкладчыкі».

«Кепска працуе стыпендыяльная камісія».

«Фактычна самакіраваннем займаецца невялікае кола, а большасць студэнтаў нават не ведае, што гэта такое».

Але іменна большасці камсамольцаў з ММФ належаць супрацьлеглыя думкі:

«Пры самакіраванні факультэцкае жыццё стала больш цікавым і разнастайным».

«Студэнты нашага факультэта амаль усе пытанні вырашаюць самастойна».

«Мы самі размяркоўваем месцы ў інтэрнаце, вырашаем пытанні быту, адпачынку, вольнага часу».

«Самакіраванне — гэта цудоўна, таму што студэнт атрымлівае магчымасць у поўнай меры адчувць сябе самастойным чалавекам».

«Толькі самакіраванне дапаможа нам стаць добрымі арганізатарамі і кіраўнікамі ў будучым».

Як бачым, з'явіліся аптымісты і песімісты. Прычым песімісты, як і заўсёды было, скардзяцца на камітэт камсамола, выкладчыкаў, дэканат і г. д. На ўсіх, акрамя саміх сябе. А скардзіцца трэба толькі на сябе. Таму што — самакіраванне.

Аб перабудове сістэмы выйшэйшай адукацыі гавораць выкладчыкі і дэканы, гавораць кіраўнікі грамадскіх арганізацый. Вось толькі нешта рэдка можна пачуць жывую, зацікаўленую размову аб гэтым у студэнцкай аўдыторыі, убачыць сапраўднае жаданне саміх студэнтаў перабудаваць універсітэцкую атмасферу, каб яна стала на самай справе інтэлектуальнай, творчай. Але ўсё ж іменна мы, студэнты, больш і лепш бачым нашы праблемы.

Напрыклад, што такое — самастойнасць студэнтаў? Акуратнае наведванне лекцый і практычных заняткаў? Выкананне дамашніх заданняў? Так. Але не толькі гэта. Самастойнасць прадугледжвае перш за ўсе магчымасць самому кіраваць працэсам сваёй адукацыі, бачыць яе мэты, гэта магчымасць займацца самаадукацыяй, гэта жаданне зайсці ў бібліятэку і лінгафонны кабінет...

— Самакіраванне на ўзроўні факультэта забяспечылі,— гаворыць І. Краўчанка.— А вось на ўзроўні групы... Тут справа за самімі камсамольцамі.

Калі паглядзець у праект «Прыкладнага палажэння аб студэнцкім самакіраванні ў Белдзяржуніверсітэце», то лёгка зразумець, што студэнцкая акадэмічная група ва ўмовах самакіравання мае вялікую колькасць правоў. Яна можа размяркоўваць стыпендыю, распрацоўваць графік экзаменацыйнай сесіі, адпускаць студэнтаў з заняткаў, хадайнічаць аб прадастаўленні членам групы матэрыяльнай дапамогі, вылучаць кандыдатаў на прысваенне ўсіх відаў імянных стыпендый і г. д. Але для гэтага ад камсамольцаў групы патрабуецца вялікая дысцыплінаванасць і адказнасць. Кіраваць — значыць у поўнай меры адказваць за сваю справу.

Вядома, вялікая роля ў гэтым належыць і камітэту камсамола, і прафсаюзнай арганізацыі. Яны — адро самакіравання, якое павінна своечасова інфармаваць камсамольцаў аб справах на факультэце, кантраляваць дзейнасць камсамольцаў.

....Розныя погляды, розныя меркаванні. З аднаго боку — аптымісты, з другога — песімісты. Як і ва ўсіх справах, дзе патрабуецца шмат энтузіязму, энергіі, цікавых прапаноў і, зразумела, вопыту. Вопыту пакуль не хапае. Але гэта толькі пакуль.

А. МАСЬКОВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

ПРАПАНУЮ...

абмяркоўваем праект самакіравання

Выключыць з параграфа 3.1. пункт: «Уносіць прапановы па размеркаванню бюджэту вышэйшай навучальнай установы».

Пункт 4.3. дапоўніць: «Уносіць у савет факультэта прапановы аб рэкамендацыі (ці не рэкамендацыі) выпускніцкой для навучання ў аспірантуры, а таксама прадстаўляць кандыдатуры для перавоза на індывідуальны план навучання».

Студэнты геафака.

Параграф 6 дапоўніць пунктам: «Выбіраць дэкана з некалькіх кандыдатур».

Л. ДЗІКЦЯРОЎ,
гістфак.

З параграфа 3.3. выключыць пункт «...нават да высялення ў надзвычайных выпадках студэнтаў на працягу навучальнага года» (супярэчыць заканадаўству).

С. БАЛАШЭНКА,
намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.

Параграф 5.2. дапоўніць: «Ацэньваць якасць лекцый выкладчыкаў пры дапамозе ананімнага анкетавання».

Прапановы сабраў
А. РУСАКОВІЧ.

палітбой

ЭРУДЫЦЫЯ ВЫБІРАЕ ДЫСКУСІЮ

— Праблема ўзнікла ў сувязі з намерамі НАТО замацавацца на стратэгічна важным востраве пасля прадастаўлення яму незалежнасці ў 1960 годзе. Пра які востраў ідзе гаворка?

Пытанне зададзена. Імкліва пабеглі секунды. Ігар Акушэвіч, намеснік сакратара камітэта камсамола фізічнага факультэта па ідэалагічнай рабоце, сёння ўпершыню выступае ў ролі секунданта.

Бой, які адбываецца ў памяшканні універсітэцкага клуба «Палітыкус», не зусім звычайны.

— А ШТО, ФІЗІКІ, калі нам правесці палітычны бой?! — да Ігара ў снежні мінулага года з гэтым пытаннем-прапановай звярнулася Ала Рыхлова, намеснік па ідэалогіі сакратара камітэта камсамола мехмата.

Ігар выклік прыняў. Разам з Алай рыхтавалі палітбой. Звярнуліся за дапамогай на кафедру КПСС прыродазнаўчых факультэтаў. З дапамогай выкладчыка кафедры А. Жыльскага распрацоўвалі пытанні.

Рыхтаваліся старанна да першага ў сваім жыцці палітбоя фізікі і матэматыкі. У час невялікага перапынку капітаны каманд Лёня Марковіч і Саша Марозаў расказалі, што выбіраць членаў каманды прыйшлося ім. Збіраліся пасля заняткаў, абмяркоўвалі апошнія падзеі ў свеце, спрачаліся.

— Фізікі, час. Ваш адказ.

Палітбой узяў некаторыя моманты конкурсу палітэрудытаў. Як сказаў Ігар Акушэвіч, гэта — мадэрнізаваная мадэль конкурсу. Арганізатары паставілі перад сабой некалькі задач: выяўленне эрудыцыі студэнтаў у палітычнай галіне, праверка здольнасці іх арыентавацца ў абставінах міжнароднага жыцця і падзей у нашай краіне, прадастаўленне магчымасці палемізаваць, спрачацца.

Новая форма, новая магчымасць праверыць сябе і навучыцца. Альберт Іосіфавіч Котаў, выкладчык кафедры КПСС і член журы ў канцы сказаў:

— Гэта добра, што вы ўжо можаце і ўмееце ставіць пытанні. І цудоўна, што спрабуеце прапаноўваць іх вырашэнне.

Палітбой закрануў самыя розныя сферы нашага жыцця. Гаворка ішла аб праблемах агульнапалітычнага плана. Разам шукалі прычыны розных спрэчных з'яў жыцця сацыялістычнага і капіталістычнага свету. А яшчэ вучыліся абвяргаць погляды буржуазных ідэолагаў.

Вельмі простая ісціна — першы раз усё рабіць цяжкавата. Адчувалася скаванасць каманд, бо, як высветлілася ў гутарцы, ніхто з іх не ўяўляў, як будзе праходзіць гэты бой.

Фізікі чакалі большай палемікі (яна ўрэшце і разгарэлася ў конкурсе капітанаў і ў дамашнім заданні). Я добра разумею Ігара Акушэвіча: два члены каманды яго факультэта па невядомых прычынах на палітбой не прыйшлі. Для сябе зазначыў ён: не зусім змаглі прадумаць арганізацыйныя моманты. І зразумела засмучэнне сакратара мехмата Іны Краўчанкі наконт таго, што мала прыйшло людзей на бой:

— Нават з тых груп, з якіх студэнты ў камандзе, і то няма нікога. Хоць і аб'ява даўно вісела.

Ці будзе працяг у палітбоя? Будзе — вырашылі яго ўдзельнікі. З задавальненнем прадоўжаць палітбой Саша Рослін, Аксана Кулік (дарэчы, адзіная дзяўчына, якая прымала ўдзел у палітбаі), Ігар Хаменка, Сяргей Каліненка (фізфак), Андрэй Мікулевіч, Міхаіл Ронжын, Дзіма Бандарэнка, Сяргей Міхневіч, Андрэй Таўгень, Алег Аслёзаў (мехмат). А Ігар Акушэвіч прапанаваў: у наступны раз трэба будзе звузіць галіну абмяркоўваемых пытанняў, ды і меншым саставам можна выстаўляць каманды.

Апошняе слова прадастаўляе журы вядучая бою Лена Апанасік.

— Перамагла каманда механіка-матэматычнага факультэта,— аб'яўляе Аляксандр Георгіевіч Жыльскі.

Добрую справу пачалі матэматыкі і фізікі. Будзем чакаць працягу.

С. ГОГАЛЬ,
наш кар.

нашы інтэрв'ю

ЖАНОЧЫ САВЕТ ВЫРАШЫЎ...

Ужо два месяцы ў нашым універсітэце працуе жаночы савет, выбраны ў снежні на сходзе прадстаўнікоў грамадскасці факультэтаў і падраздзяленняў. Мы звярнуліся да старшыні жаночага савета дацэнта кафедры цеплафізікі Алы Станіславаўны Каспяровіч, выкладчыка кафедры фізвыхавання Людмілы Канстанцінаўны Артамонавай і асістэнта кафедры інфарматыкі факультэта прыкладной матэматыкі Людмілы Андрэеўны Піліпчук з просьбай расказаць пра асноўныя напрамкі дзейнасці жансавета БДУ.

А. КАСПЯРОВІЧ: Камітэт савецкіх жанчын, які нядаўна сабраў свой актыў і прадстаўнікоў жансаветаў, паставіў новыя задачы і адкрыў новыя магчымасці актывізацыі жаночага руху ў краіне. Стварэнне ў краіне адзінай сістэмы жаночых саветаў накіравана на павышэнне ролі жанчыны ў грамадскім жыцці, прывядзенне ў дзеянне яе вялікага сацыяльнага, працоўнага і духоўнага патэнцыялу. Дайсці да кожнай жанчыны, дапамагчы ёй вызначыць сваё месца ў агульных справах, у перабудове — гэта асноўная задача жансаветаў.

Жансавет нашага універсітэта вызначыў для сябе чатыры асноўныя напрамкі: грамадска-палітычную, культурна-масавую, спартыўна-аздараўленчую работу; вылучаны ў якасці самастойнага напрамку работы сектар «Сям'я і школа». У нас шмат планаў. Ужо сёння можна гаварыць пра работу ў жансавеце спартыўна-аздараўленчай камісіі (старшыня Л. К. Артамонава), сектара «Сям'я і школа» (старшыня Л. А. Піліпчук).

Л. К. АРТАМОНАВА: Спартыўна-аздараўленчая камісія жансавета лічыць галоўнай сваёй задачай арганізацыю сямейнага адпачынку супрацоўнікаў універсітэта. Тое-сёе ў гэтым напрамку мы ўжо здзейснілі. Так, 1 сакавіка 50 супрацоўнікаў БДУ і члены іх сем'яў ездзілі на лыжную прагулку поездам «Здароўе». Для жадаючых падмацаваць сваё здароўе працуе група агульнафізічнай падрыхтоўкі для жанчын. Запрашаем сюды ўсіх жадаючых (спартыўная зала галоўнага корпуса, аўторак і пятніца з 17.00 да 18.00). Удалося забяспечыць і на сакавік абанементамі ў басейн. А ў планах — правядзенне ў маі на стадыёне ў Шчамысліцы конкурсу «Тата, мама, я — спартыўная сям'я».

Л. А. ПІЛІПЧУК. Работу сектара «Сям'я і школа» лічым адным з важнейшых напрамкаў дзейнасці жансавета. У сям'і ў першую чаргу закладваюцца асновы маральнага выхавання, фарміруюцца жыццёвыя прынцыпы. Ад таго, якія каштоўнасці, інтарэсы знаходзяцца на першым плане ў сям'і, залежыць, якімі вырастуць дзеці.

Па ініцыятыве нашага сектара пачынае працу семінар «Майстэрства выхавання ў сям'і». Яго мэта — абмеркаванне маральна-педагагічных прынцыпаў узаемаадносін у сям'і. Цяпер мы рыхтуем вечар адпачынку выкладчыкаў, які адбудзецца 28 сакавіка ў 18.00 у Доме кіно. Тэма першага абмеркавання, якім і пачнецца гэты вечар,— «Мастацтва і кінематограф ставяць праблемы. Некаторыя аспекты ідэйна-маральнага выхавання моладзі». Вельмі б хацелася пачуць думкі і парады ўдзельнікаў вечара, таму што мы плануем работу семінара прадоўжыць.

ЗАПІСАЛА
Н. ГУЛЕЙЧЫК.

кірмаш салідарнасці

Ляці, голуб міру!

Працаўніца-мурашка спынілася на імгненне, разагнула спіну, абхапіла лапкамі зямны шар. Гэта — эмблема сёмага паліткірмашу, арганізатарамі якога сталі навучэнцы ВНУ Мінска, у тым ліку і БДУ, члены Саюза свабоднай нямецкай моладзі. А чаму іменна мурашка стала сімвалам кірмашу?

— ГЭТА маленькая, але моцная істота. Яна можа несці вялікі цяжар,— гаворыць Сабіна Хоман.— ГДР таксама не вялікая дзяржава, але ўсе разам мы робім вялікую справу.

Сабіна бярэ ў рукі пэндзлік. І праз некалькі хвілін на белым аркушы з'яўляецца сімпатычная мурашка.

Лейтматыў сёлетняга паліткірмашу — «1000 рублёў для Нікарагуа». Гэта краіна нясе зараз на сваіх плячах непамерна вялікі цяжар.

— Але нават сённяшні палітычны кірмаш дапаможа маёй краіне,— гаворыць Рамеа Альбарэс Аэгёа.— Не адчуваеш сябе ў адзіноцтве, калі бачыш столькі добразычлівых маладых твараў.

Кірмаш салідарнасці гамоніць маладымі галасамі. Гаспадары яго, юнакі і дзяўчаты з ГДР, запрашаюць кожны да свайго століка.

Так, кірмаш шчыры на знаёмствы. Добра ён і частуе. Юнакі, закасаўшы рукавы, спрытна размешваюць цеста, кладуць начынку, надаюць патрэбную форму. Праз некалькі хвілін апетытныя крэпелі гатовы. Жадаючыя з ахвотай спрабуюць нямецкую нацыянальную страву.

Шмат работы і ў Габі Фогент і Дагны Вінтэр. Вунь якая чарга выстраілася, каб паспрабаваць малочны кактэйль ці падмацавацца бутэрбродамі з кавай.

— Мы лічым, што накарміць удзельнікаў кірмашу — справа далёка не апошняя,— усміхаецца Габі.— І вельмі рады, што кожнае «дзякуй» гаворыцца ад душы.

Недалёка ад буфета працуе атэлье мод. Жадаючых пазнаёміцца з яе навінкамі хапае.

— У гэтым годзе зноў у пашане спартыўны стыль. Так што, дзяўчаткі, абавязкова рабіце зарадку — і настрой імгненна з'явіцца, і тканіны меней спатрэбіцца,— апошнія словы вядучай заглушае смех, які тут дапамагае лепей зразумець адзін аднаго.

Крочым па кірмашу далей. Калі жадаеце на памяць сфатаграфавацца, калі ласка! Свае паслугі прапаноўвае фотаатэлье. А ў спартыўнай зале можна не толькі паказаць свой спрыт на турніку, паспаборнічаць у меткасці (шасцю шарамі збіць піраміду з дванаццаці банак). Тут можна купіць сувеніры, плакаты, часопісы.

А цяпер давайце зазірнем у актавую залу.

«Вышэй, вышэй, голуб міру, абляці ўвесь свет»,— пяюць удзельнікі клуба палітычнай песні філфака БДУ, якія пачалі канцэртную праграму.

— Гэту песню напісала простая нямецкая жанчына для сваіх дзяцей у гады другой сусвет-

— Дзе мір — там свята, дзе свята — там мір,— гавораць са сцэны йеменскія студэнты.

Адзін другога змяняюць мастацкія калектывы, прадстаўнікі розных краін, гучаць нацыянальныя мелодыі. Але аб'ядноўвае іх адзін матыў — спяваць і змагацца.

...Двухгадовы Андрэйка Фёдараў (бадай што самы малы ўдзельнік палітычнага кірмашу), схаваўшыся за бацьку, здзіўлена пазірае навокал. Але ў яго таксама ёсць меркаванне наконт кірмашу:

— Падабаецца...

Пройдзе час. Андрэйка вырасце. І сярод першых слоў, якія ён напіша, абавязкова будзе слова «мір». Гэтае ж слова гучыць у кожным радку рэзалюцыі, прынятай сёмым паліткірмашом. «Выказваем падтрымку народам Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, Нікарагуа. І спадзяёмся, што розум пераможа вайну»,— чытаюць маладыя ў рэзалюцыі і ставяць свае подпісы.

А. КРУПІЦА,
А. ДОРСКАЯ,
студэнткі факультэта журналістыкі.
Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

Запрашальны білет

ПРАГРАМА

ПРАВЯДЗЕННЯ НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ ТЫДНЯ КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (31 САКАВІКА — 8 КРАСАВІКА 1987 г.)

ДЗЕНЬ ПЕРШЫ — 31 САКАВІКА

12.00	Актавая зала філфака	Адкрытая лекцыя в. а. прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа Дз. Я. Бугаёва.
14.00	Філфак аўд. 45	Адкрыццё аўдыторыі імя заслужанага дзеяча навукі БССР, прафесара, доктара філалагічных навук М. Р. Ларчанкі. Слова пра М. Р. Ларчанку — заг. кафедры А. А. Лойка. Успаміны пра настаўніка, педагога, вучонага, дэкана філалагічнага факультэта М. Р. Ларчанку (В. В. Казлова, Н. С. Гілевіч, М. Б. Яфімава, К. Р. Хромчанка, Дз. Я. Бугаёў, В. П. Рагойша, Л. К. Тарасюк). Конкурс на лепшага чытальніка. Карнавал літаратурных герояў.

ДЗЕНЬ ДРУГІ — 1 КРАСАВІКА

14.00	Філфак аўд. 43	Кафедральны семінар «Літаратуразнавец». Тэма: «Літаратура і гісторыя».

ДЗЕНЬ ТРЭЦІ — 2 КРАСАВІКА

12.00	Актавая зала	У нас у гасцях БелСЭ (І. Шамякін, А. Петрашкевіч, У. Саламевіч і інш.)
14.00	Актавая зала	Адкрытая лекцыя прафесара А. А. Лойкі.

ДЗЕНЬ ЧАЦВЕРТЫ — 3 КРАСАВІКА

15.00	Актавая зала	Адкрытае пасяджэнне кафедры. На парадку дня: «Працуем па-новаму». 1) Праца кафедры над новымі праграмамі па беларускай савецкай і старабеларускай літаратурах. 2) Пытанні інтэнсіфікацыі самастойнай работы студэнтаў. 3) Дыпломная работа. Як яе пісаць? Якой яна павінна быць?

ДЗЕНЬ ПЯТЫ — 4 КРАСАВІКА

14.00	Актавая зала	Адкрытая лекцыя дацэнта У. А. Навумовіча.
19.00	Інтэрнат № 7	Вечар літаб'яднання «Узлёт» у інтэрнаце па вуліцы Кастрычніцкай. Конкурс маладых паэтаў.

ДЗЕНЬ ШОСТЫ — 7 КРАСАВІКА

Дзень фальклорна-лінгвістычнай лабараторыі пры кафедры. Конкурс народнай песні.

ДЗЕНЬ СЕМЫ— 8 КРАСАВІКА

10.00—13.00	СШ № 122	Кафедра ў школе.
19.00	Актавая зала	Сустрэча на факультэце з народным пісьменнікам Беларусі Васілём Быкавым.

анкета

Ф. Скарына і беларуская літаратура

Па рашэнню ЮНЕСКО ў 1990 годзе ва ўсім свеце будзе шырока адзначацца 500-гадовы юбілей славутага беларускага асветніка, першадрукара Ф. Скарыны. Вучоныя, пісьменнікі, мастакі (і не толькі Беларусі, а і іншых рэспублік Савецкага Саюза) звяртаюцца да спадчыны нашага вялікага продка, імкнуцца больш пільна разгледзець праз стагоддзі асобу славутага земляка, спазнаць яго думку і слова.

Прапануем пытанні нашым студэнтам і выкладчыкам, якія задае Аляксей Канстанцінавіч Каўко, аўтар будучай кнігі, прысвечанай Ф. Скарыне:

1. Калі, пры якіх абставінах Вы ўпершыню даведаліся аб Францішку Скарыне як беларускім першадрукару і гуманісту-асветніку?
2. Ці даводзілася Вам знаёміцца з арыгінальнымі выданнямі Скарыны? Уражанні?
3. Што, на Вашу думку, мела найбольш адчувальны ўплыў са спадчыны Скарыны пры адраджэнні беларускай літаратуры:
   а) кнігадрукаванне;
   б) беларуская літаратурная мова;
   в) маральна-эстэтычныя, патрыятычныя ідэі;
   г) асоба Скарыны;
   д) іншае.
4. Як Вам бачыцца месца Ф. Скарыны ва ўсходне- і агульнаславянскім кантэксце?
5. Што, на Вашу думку, варта зрабіць дзеля лепшага засваення, папулярызацыі духоўнай спадчыны Ф. Скарыны?
6. Можаце падаць кароткія звесткі аб сабе:

Прозвішча, імя, імя па бацьку. Узрост. Прафесія. Характар заняткаў. Адрас.

Свае меркаванні (можна выкласці ў любой, ямчэйшай для Вас форме) дашліце, калі ласка, па адрасу: 103055, Москва, Угловой пер. 4, кв. 89. Кавко Алексею Константиновичу.

КАЛЕКТЫЎ ТРЫМАЕ СПРАВАЗДАЧУ

НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ — НОВАЕ ЦІКАВАЕ ПАЧЫНАННЕ: АДКРЫВАЮЦЦА ТЫДНІ КАФЕДР. НА ПРАЦЯГУ ТЫДНЯ КОЖНАЯ З СЯМІ КАФЕДР ФАКУЛЬТЭТА БУДЗЕ ТРЫМАЦЬ ПОЎНУЮ І СТРОГУЮ СПРАВАЗДАЧУ АБ СВАЕЙ ВУЧЭБНАЙ, ВЫХАВАЎЧАЙ, НАВУКОВАЙ І ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ. РАСПАЧАЦЬ МЕРАПРЫЕМСТВА ДАРУЧАНА КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ.

ЧЫМ ЖА ЗАСЛУЖЫЛА КАФЕДРА ТАКІ ГОНАР І ДАВЕР?

КАБ АДКАЗАЦЬ на гэтае пытанне, трэба хаця б коратка спыніцца на гісторыі і сённяшнім дні адной са старэйшых кафедр універсітэта.

Кафедра беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна вядзе сваю радаслоўную з далёкага 1922 года. Такім чынам, яна толькі на адзін год маладзейшая за сам універсітэт, сёлета ёй спаўняецца 65 год. Першым загадчыкам яе быў вядомы вучоны-літаратуразнавец, прафесар, пазней — акадэмік АН БССР, член-карэспандэнт АН СССР І. І. Замоцін (1873—1942). Апрача беларускай, кафедра забяспечвала выкладанне рускай, замежнай літаратуры, тэорыі літаратуры і фальклору не толькі на педфаку з яго літаратурна-лінгвістычным аддзяленнем (пародзічам сённяшняга філфака), але і на іншых нешматлікіх тады факультэтах універсітэта: рабочым, грамадскіх навук. Працавалі на кафедры такія вядомыя вучоныя, як прафесары Я. І. Барычэўскі (1883 — 1934), А. М. Вазнясенскі (1888—1966), М. М. Піятуховіч (1891—1938), дацэнт А. А. Бабарэка (1899—1938). Літаратурны аўтарытэт кафедры падтрымліваў Якуб Колас, які хоць і чытаў (у 1923—1926 гг.) лекцыі па сучаснай беларускай мове і методыцы яе выкладання, быў усё ж менавіта літаратурным сэрцам педагагічнага факультэта і ўсяго універсітэта.

Высокі аўтарытэт кафедры ў значнай ступені садзейнічаў таму, што ў Белдзяржуніверсітэт пацягнулася літаратурная моладзь. У лютым 1928 г. часопіс «Маладняк» расказваў сваім чытачам: «Беларускі дзяржаўны універсітэт з'яўляецца ў сучасны момант сапраўдным пісьменніцкім асяродкам на Беларусі. Значная частка беларускіх пісьменнікаў і паэтаў вучыцца зараз на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні. Штодня ў памяшканнях універсітэта можна сустрэць Крапіву, Александровіча, В. Каваля, С. Хурсіка, Фаміна, Дудара, Якімовіча, Барашку і інш. У будынку універсітэта ў большасці наладжваюцца літаратурныя вечары, дыспуты, даклады. За адсутнасцю будынка пісьменнікаў (ён быў адчынены ў канцы 1928 года.— В. Р.) універсітэт заслугоўвае поўнае права быць названым пісьменніцкім асяродкам».

Апрача названых у заметцы літаратараў, у 20-я — пачатку 30-х гг. ва універсітэце вучыліся многія іншыя пісьменнікі, якія пазней склалі славу і гонар беларускай савецкай літаратуры: К. Чорны, П. Броўка, П. Глебка, Я. Скрыган, П. Трус, М. Лужанін, А. Пальчэўскі, М. Зарэцкі, С. Баранавых, М. Хведаровіч, А. Звонак і інш. А колькі таленавітых педагогаў, даследчыкаў і прапагандыстаў роднай літаратуры, кваліфікаваных журналістаў даў рэспублікі універсітэт пры самай актыўнай дапамозе кафедры літаратуры! Зрэшты, мы ведаем, колькі: са сцен БДУ за 1921—1931 гг. выйшла 336 філолагаў, сярод іх больш сарака літаратараў — паэтаў, празаікаў, крытыкаў, тэарэтыкаў і гісторыкаў літаратуры.

Чаму я назваў 1931 год? Бо ў гэтым годзе па пастанове СНК БССР на базе педфака БДУ быў створаны Вышэйшы педагагічны інстытут, куды цалкам перайшла і кафедра літаратуры. Толькі ў 1939 г. зноў пачалі рыхтаваць ва універсітэце філолагаў, гэтым разам — на спецыяльным філалагічным факультэце. Аднак працу выкладчыкаў беларускай літаратуры і ўсяго універсітэта неўзабаве перапыніла нямецка-фашысцкая агрэсія. Прафесары, дацэнты, студэнты філфака са зброяй у руках сталі змагацца з фашысцкай навалай. Многія не вярнуліся з франтоў, партызанскіх атрадаў. Многіх не далічыліся на першай універсітэцкай паверцы ў верасні 1943 г., калі, згодна пастанове СНК СССР ад 15 мая 1943 г., на станцыі Сходня пад Масквой аднавіў сваю працу Белдзяржуніверсітэт. Дастаткова сказаць, што 1 лютага 1944 г. у БДУ на ўсіх факультэтах (філалагічным, гістарычным, біялагічным, геаграфічным, хімічным і фізіка-матэматычным) вучылася толькі... 89 чалавек. З іх 90 працэнтаў складалі жанчыны.

З 1943 г. пачала сваю працу кафедра беларускай мовы і літаратуры, якую ўзначаліў, вярнуўшыся з армейскага шпіталя, дацэнт, пазней прафесар, заслужаны дзеяч навукі БССР М. Р. Ларчанка (1907—1981). У вялікай ступені дзякуючы падзвіжніцкай дзейнасці М. Ларчанкі універсітэт паступова пачаў зноў набываць славу «пісьменніцкага асяродка», пачалі актыўна расці ва універсітэце кадры вучоных-літаратуразнаўцаў не толькі для сваіх патрэб, але і для патрэб усёй рэспублікі (ВНУ, АН БССР). Сама ж кафедра навідавоку расла колькасна і якасна. У 1956 г. ад яе адлучылася і стала самастойнай адзінкай кафедра беларускай мовы. Кафедра беларускай літаратуры набыла славу адной з лепшых профільных кафедр не толькі ва універсітэце, але і ва ўсёй рэспубліцы. Эстафету М. Ларчанкі падхапілі, з годнасцю пранеслі і нясуць цяпер вопытныя выкладчыкі, вядомыя вучоныя акадэмік АН БССР І. Я. Навуменка, які ўзначальваў кафедру ў 1971—1973 гг., дацэнт В. В. Казлова, якая кіравала кафедрай у 1973—1985 гг., прафесар А. А. Лойка, сённяшні яе загадчык. У розны час на кафедры працавалі прафесары Ю. С. Пшыркоў (1912—1980), С. Х. Александровіч (1921—1986), народны пісьменнік БССР, лаўрэат Ленінскай прэміі І. П. Мележ (1921—1976), які, скончыўшы універсітэт і аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры, у 1948—1951 гг. выкладаў на філфаку беларускую літаратуру, дацэнты С. А. Гусак (1930—1969), Р. М. Семашкевіч (1945—1982). Гэтым і іншым літаратуразнаўцам-выкладчыкам у многім абавязаны сваімі ведамі і любоўю да роднай літаратуры вядомыя беларускія пісьменнікі і вучоныя, якія скончылі універсітэт у пасляваенны час. Сярод іх — А. Адамовіч, М. Аўрамчык, М. Лобан, А. Васілевіч, Л. Арабей, В. Палтаран, У. Дамашэвіч, П. Ткачоў, А. Вярцінскі, М. Арочка, А. Мальдзіс, І. Пташнікаў, І. Чыгрынаў, В. Адамчык, В. Карамазаў, Р. Барадулін, М. Стральцоў, Г. Бураўкін, В. Зуёнак, Я. Сіпакоў, Б. Сачанка, А. Кудравец, А. Жук, Я. Янішчыц, С. Законнікаў і многія іншыя. Большасць з іх прайшлі праз літаратурныя гурткі, якімі кіравалі М. Ларчанка, Ю. Пшыркоў, І. Навуменка, праз літаратурнае аб'яднанне «Узлёт», якім з 1964 г. — з часу яго заснавання — кіруе А. Лойка. На рахунку «Узлёту» — шэсць друкаваных зборнікаў паэзіі. Шчырае слова падзякі выкладчыкам кафедры беларускай літаратуры вусна і пісьмова выказваюць ужо не сотні, а тысячы настаўнікаў-беларусістаў, сотні супрацоўнікаў АН БССР, рэдакцый, выдавецтваў, перыядычных выданняў, радыё і тэлебачання — установ, дзе працуюць філолагі.

Што ж уяўляе сёння кафедра беларускай літаратуры універсітэта?

Гэта высокакваліфікаваны, мэтанакіраваны, зладжаны калектыў са сваім таварыскім, патрабавальным мікракліматам, вялікім навуковым і творчым патэнцыялам. На кафедры працуе 20 выкладчыкаў, з іх два — прафесары і дзесяць — кандыдаты навук, дацэнты. Сем выкладчыкаў кафедры — прафесары А. Лойка і Н. Гілевіч, дацэнты Д. Бугаёў, К. Хромчанка, Т. Шамякіна, Л. Тарасюк, В. Рагойша — з'яўляюцца членамі Саюза пісьменнікаў БССР. Кафедра забяспечвае выкладанне курсаў гісторыі беларускай літаратуры, беларускай вуснай народнай творчасці, тэорыі літаратуры, літаратуры народаў СССР і методыкі беларускай літаратуры на ўсіх формах навучання факультэтаў філалагічнага і журналістыкі. Праблемы станаўлення сацыялістычнага рэалізму, ідэйна-эстэтычнае багацце і своеасаблівасць беларускага фальклору, сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі народаў СССР і замежных сацыялістычных краін, гісторыя беларускай дарэвалюцыйнай літаратуры — такія галоўныя кірункі навуковых пошукаў кафедральных літаратуразнаўцаў. Па гэтых праблемах супрацоўнікамі кафедры апублікавана звыш ста манаграфій, а таксама звыш 2000 артыкулаў і рэцэнзій агульным памерам звыш 1000 друкаваных аркушаў. Апрача гэтага, на рахунку кафедры звыш 100 кніг арыгінальнай і перакладной мастацкай прозы і паэзіі. У даследаванні роднай літаратуры, а таксама ў яе выкладанні значных поспехаў дабіліся (акрамя ўжо згаданых вышэй) дацэнты В. В. Казлова, М. Б. Яфімава, В. А. Лашкевіч, У. А. Навумовіч, І. М. Ключановіч, кандыдат філалагічных навук Л. Д. Корань, выкладчыкі А. М. Шыловіч, Л. А. Ламека, В. К. Каратай, Т. В. Каваленка, Л. У. Карпава, В. В. Каладзінскі, П. І. Навуменка.

Пачынаючы з 1951 г., кафедра падтрымлівае цесныя сувязі з шэрагам вядучых саюзных і замежных універсітэтаў. Асобныя яе вучоныя прымалі ўдзел у з'ездах славістаў, іншых міжнародных сімпозіумах, чыталі лекцыі ў Сафійскім, Варшаўскім, Кракаўскім, Йенскім і іншых універсітэтах. На кафедры праходзяць стажыроўку аспіранты і выкладчыкі з ГДР, НРБ, ПНР. Кафедра з 1960 года з'яўляецца пастаяннай пераможцай сацыялістычнага спаборніцтва на факультэце.

На кафедры вядзецца вялікая грамадская работа. І не толькі на факультэцкай і універсітэцкай «дзялянках». Асобныя супрацоўнікі кафедры з'яўляюцца членамі або нават старшынямі розных грамадскіх арганізацый гарадскіх, рэспубліканскіх і нават усесаюзных. Выхаванцы кафедры ўзначальваюць розныя ўстановы рэспублікі. Так, І. Навуменка сёння — віцэ-прэзідэнт АН БССР, Н. Гілевіч — першы сакратар Саюза пісьменнікаў БССР.

Усім гэтым, пра што я расказаў, і заслужыла кафедра беларускай літаратуры гонар распачаць на філалагічным факультэце тыдні кафедр. Хто хоча бліжэй пазнаёміцца з яе працай, кажам: сардэчна запрашаем на ўсе мерапрыемствы, якія арганізуе кафедра!

В. РАГОЙША,
дацэнт кафедры беларускай літаратуры.

«Твор сучасны, праўдзівы

Кніга Э. Скобелева «Выпускнікі» (выд. «Юнацтва», 1984) не мае дакладна вызначанага сюжэта: змест яе складаюць разважанні, роздумы, назіранні трох навучэнцаў-выпускнікоў ГПТВ Івана Сахно, Мікалая Паддубіцкага, Тані Бондар. Яны задумваюцца над усім: над сэнсам жыцця, прызначэннем чалавека, над пытаннямі кахання, сяброўства, шчасця, гераізму, будучага.

ЖЫЦЦЁ паказана ў гэтай кнізе не спрошчана, вобразы яе неадназначныя. Сустракаемся тут з нягоднікам Маркіным, з падонкам Кучмелем, з цынікам Князем, з прахіндзеем Лашковым і інш. Адносіны да іх аўтара і галоўных герояў непрымірымыя. «Добра было б, каб мы не патуралі нягоднікам»,— разважае Мікалай Паддубіцкі. Але што значыць не патураць? Мікалай б'е па твары агіднага яму Маркіна, узнікае канфлікт. Усе чакаюць камсамольскага сходу, на якім павінна вырашацца: хто ёсць хто? Але ці вырашаецца? Не кожны здольны адкрыта сказаць праўду. Нават камсорг групы Іван Сахно, якога ўсе (і ён сам) лічаць станоўчым. Наогул жыццё Івана нечакана ўскладнілася настолькі, што ён, заўсёды ўраўнаважаны і самаўпэўнены, траціць спакой, пакутуе.

Іван, Мікалай, Таня жывуць напружаным духоўным жыццём, таму і інтэлектуальны ўзровень кнігі «Выпускнікі» высокі. У ёй шмат мудрых афарызмаў, думак, якія дапамагаюць чытачам больш востра адчуць прывабнасць і складанасць жыцця. «Выпускнік» — сучасны, праўдзівы твор. Напісаны ён з верай у нашу моладзь, у перамогу дабра.

І. ВОЙНІЧ.

СЯРОД ТВОРАЎ В. ВІТКІ ЁСЦЬ КНІГА, ЯКАЯ НАДЗВЫЧАЙ МОЦНА ЎРАЗІЛА МЯНЕ. ГЭТА «ДЗЕЦІ І МЫ», ЯКАЯ З'ЯВІЛАСЯ Ў 1977 ГОДЗЕ. ЯНА НІБЫ СЁННЯ НАПІСАНА, НАСТОЛЬКІ ЎСЁ У ЁЙ СУГУЧНА НАШАМУ ЧАСУ.

«ДЗЕЦІ І МЫ»

ТУТ ВЫКАЗАНЫ запаветныя думкі пісьменніка па многіх пытаннях выхавання і навучання дзяцей.

Педагагічныя роздумы В. Віткі заснаваны на тэарэтычных прынцыпах Ушынскага, Макаранкі, Сухамлінскага, яны ўвабіраюць таксама асабістыя назіранні пісьменніка і вопыт народнай педагогікі. Сцвярджаецца думка пра тое, што выхаванне дзяцей пачынаецца з любві да іх. «Дабрату можна выхаваць толькі дабратой, давер — даверам, душэўнасць — душэўнасцю».

Асобнае месца адведзена ў кнізе «Дзеці і мы» праблемам працоўнага, эстэтычнага, патрыятычнага выхавання, вялікай адказнасці сям'і і школы.

Дзіця — не забаўка, не цацка,— папярэджвае В. Вітка,— гэта маленькі грамадзянін, і за яго лёс нясуць у першую чаргу адказнасць бацькі. У многім ад маці залежыць, якімі людзьмі вырастуць яе дзеці. Аўтар гэтай змястоўнай і захапляючай кнігі гаворыць пра неабходнасць паставіць сямейную педагогіку на трывалую навуковую аснову, дабіцца, каб сям'я стала памочнікам і саюзнікам школы.

Пераканаўча піша В. Вітка пра ролю педагога, пра яго высокае прызванне і адказнасць. «Няшчасны на ўсё жыццё той чалавек,— гаворыць ён.— якому не трапіўся настаўнік, які адкрыў бы яму радасць і асалоду далучэння да нявыказанага хараства слова, да скарбаў паэзіі». Узнімаюцца надзвычай надзённыя сёння пытанні павышэння агульнай культуры настаўніка, яго духоўнага ўзбагачэння, удасканалення педагагічнага майстэрства.

Адзін з раздзелаў кнігі называецца «Уваход дарослым дазваляецца». Назва гэтая гучыць інтрыгуюча. Сапраўды, тут адкрываецца шмат таямніц дзіцячага ўспрыняцця, на якія дарослыя часта не звяртаюць увагі. З усмешкай здзіўлення, з радасцю за дзяцей чытаюцца «Дыялогі з унучкамі». Тут нічога не прыдумана: так думаюць і гавораць дзеці. Гэтыя маленькія шэдэўры створаны імі:

СТУПА

— А я ведаю, што такое ступа.
— Што?
— Ракета бабы-ягі.

БЕЗ МАСКІ

— Кім ты была на маскарадзе?

Чалавекам. У мяне не было маскі.

Ці можна ўсумніцца, прачытаўшы гэтыя дыялогі з унучкамі, у геніяльнасці дзяцей?

Кніга «Дзеці і мы» прасякнута павагай і любоўю да дзяцей, у ёй своеасабліва раскрыўся талент В. Віткі — пісьменніка, удумлівага педагога і чалавека.

«Заўсёды добрыя творы прарастуць кветкамі дабра, прыгажосцю учынкаў»,— сцвярджае В. Вітка.— І словы гэтыя можна аднесці да ўсёй яго творчасці, якая атрымала прызнанне. За заслугі ў галіне развіцця дзіцячай літаратуры В. Вітка ўдастоены звання лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, першым з беларускіх пісьменнікаў ён адзначаны Міжнародным Ганаровым дыпломам імя Х. К. Андэрсена.

Н. СТЫПУЦЬКА.

УСЕСАЮЗНЫ ТЫДЗЕНЬ дзіцячай і юнацкай літаратуры штогод прыходзіць да нас у праменнях веснавога сонца, пад звон сакавіцкіх капяжоў. Прыходзіць найперш як свята юных чытачоў, аднак да яго не можа застацца абыякавым ніхто з тых, хто любіць дзяцей, зацікаўлены іх лёсам, пытаннямі выхавання маладой змены.

Прапануем увазе чытачоў (у значным скарачэнні) асобныя рэцэнзіі і водгукі на кнігі для дзяцей беларускіх аўтараў. Напісаны гэтыя рэцэнзіі студэнтамі II курса філалагічнага факультэта (аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры), якія слухалі спецкурс па беларускай дзіцячай літаратуры.

М. ЯФІМАВА,
дацэнт кафедры беларускай літаратуры, кандыдат філалагічных навук.

І РАДУЮЦЬ, І ВЫХОЎВАЮЦЬ

Жыццё не песціла Вісарыёна Сцяпанавіча Гарбука. Цяжкімі былі і дзяцінства, і маладосць, і сталыя гады пісьменніка.

ЁН СКОНЧЫЎ Лепельскі педагагічны тэхнікум, потым літфак Мінскага педінстытута імя М. Горкага (завочна). Праца настаўніка дала В. Гарбуку вельмі многа. Ён сам пісаў: «Ні адно апавяданне пра дзяцей і для дзяцей не было б напісана, калі б я не працаваў ў школе».

В. Гарбук удзельнічаў у абароне Масквы, у вызваленні Беларусі, Польшчы, ён распісаўся у Берліне на сцяне рэйхстага.

Пісаў на беларускай і рускай мовах. Дзецям прызначаны зборнікі яго апавяданняў «Алачка-забывалачка», «На маім акне», «Такіх кветак не бывае», «Хто такія мы» і інш.

Апавяданні В. Гарбука адкрываюць чытачам непаўторны свет дзіцячых уяўленняў, гульняў і забаў. Яго героі дапытлівыя, няўрымслівыя, чулыя да прыгажосці. Яны гуляюць у «шалаш Ільіча» («Шалаш»), малююць на асфальце гарадской плошчы касманаўтаў і свае дамы («Твар у палоску»), складаюць казкі («Сама казку склала»). Пісьменніка захапляюць багацце дзіцячай фантазіі, своесаблівасць успрымання, аптымізм.

Многія творы В. Гарбука звернуты да дарослых. Яны адкрываюць ім загадкавы свет дзяцінства, пераконваюць дарослых ў тым, што неасцярожнае слова, няўвага могуць падарваць давер дзяцей да дарослых, пакрыўдзіць іх.

З павагай В. Гарбук піша пра тых, хто любіць дзяцей, тонка адчувае дзіцячую душу, умее адкрыць малым штосьці прыгожае ў жыцці, абудзіць у іх цікаўнасць, ахвоту да карыснага занятку. Такім душэўным чалавекам у апавяданні «Алачка-забывалачка» з'яўляецца маці Алачкі. З сапраўдным педагагічным майстэрствам адвучвае яна сваю дачушку ад благой звычкі хітраваць. Гэтак жа тактоўна адвучвае маці з апавядання «Што важней» сваю дачку ад залішняй самаўпэўненасці, пахвальбы. Апавяданні В. Гарбука вучаць дзяцей думаць, шчыра сябраваць, дапамагаць дарослым, быць сумленнымі і добразычлівымі.

Вышэйшая ацэнка працы любога пісьменніка — гэта любоў і ўдзячнасць чытачоў. Творы Вісарыёна Гарбука любяць. Яны прыносяць і малым, і дарослым мастацкую асалоду і тактоўна вучаць чалавечнасці.

С.САЧАНКА.

З ТВОРАЎ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ПРОЗЫ МНЕ ХОЧАЦЦА ВЫЛУЧЫЦЬ АПОВЕСЦЬ ЯЎГЕНА РЫГОРАВІЧА РАДКЕВІЧА «ПЕШШУ ПРАЗ ГАЛАКТЫКУ» (ВЫД. «ЮНАЦТВА», 1984), ЯКАЯ НА РЭСПУБЛІКАНСКІМ КОНКУРСЕ НА ЛЕПШЫ ЛІТАРАТУРНЫ ТВОР ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ЮНАЦТВА, ПРЫСВЕЧАНЫМ 60-ГОДДЗЮ ЎТВАРЭННЯ СССР, БЫЛА АДЗНАЧАНА ДРУГОЙ ПРЭМІЯЙ.

Якой настаўніцай стану?

НА МЯНЕ як будучую настаўніцу аповесць «Пешшу праз Галактыку» зрабіла вялікае ўражанне, прымусіла задумацца над тым, на што я здатная, якой настаўніцай стану. Можа такой, як Тамара Карпаўна, «хімічка», якая гаворыць з вучнямі «раўнадушным голасам білетнага касіра» і якую баяцца вучні? Ці, можа, такой, як Вольга Іванаўна, настаўніца матэматыкі, якая выдатна ведае свой прадмет, любіць дзяцей, але не ўмее падтрымліваць дысцыпліну, бо не можа зразумець, што вучні старэйшых класаў амаль ужо дарослыя і да іх нельга ставіцца як да малых? Не, гэта не мой ідэал настаўніцы.

Хочацца быць падобнай на настаўніцу мовы і літаратуры Веру Пятроўну, якая выкладае свой прадмет з асалодай і натхненнем і можа стаць для вучняў і Таццянай Ларынай, і Наташай Растовай, і Верай Паўлаўнай, і Любкай Шаўцовай... Здаралася, што Вера Пятроўна на ўрок, на якім разбіраліся, напрыклад, вобразы памешчыкаў з «Мёртвых душ», прыносіла раман сучаснага пісьменніка і з захапленнем чытала яго асобныя старонкі. А назаўтра вучні станавіліся ў чаргу за гэтай кнігай...

Аповесць Я. Радкевіча, несумненна, зацікавіць вучняў старэйшых класаў, для якіх яна напісана. Яны знойдуць тут не толькі займальны сюжэт, але і пазнаюць сябе і сваіх сяброў у вобразах Сашы Давыдзюка, Аркашкі Смоліна, Зіны Васкоўцавай, Барыса Красько, зразумеюць сутнасць Рамана Янкоўскага, што любіць мяняць скуру пад колер таго, з кім хоча мець справу, навучацца добразычліва адносіцца да людзей, разумець, бачыць тых, хто, як завуч Пац, за ласкавай усмешкай і словамі хавае сваю крывадушную сутнасць.

Цікавай будзе кніга і для бацькоў. Зразумела, Саша не заўсёды паводзіў сябе з бацькамі правільна, але ж і бацькі яго, адукаваныя людзі, не разумелі доўга, што сын ужо не маленькі і з гэтым трэба лічыцца. «Вы можаце нарэшце зразумець,— гаворыць Саша,— што перад вамі не смаркатае дзіця, а чалавек з пашпартам?» Саша ўцякае з дому, але ўрэшце бацька зрабіў для сябе належныя вывады і вярнуў давер сына. Больш мудрым стаў і Саша.

У лісце да сябра ён прызнаецца: «...давялося перажыць гэтак многа за апошнія некалькі месяцаў, што іншы раз мне здаецца, быццам я зрабіў неверагодна доўгае і нялёгкае падарожжа праз усю Галактыку. І прытым пешшу...»

Аповесць Я. Радкевіча актуальная, яна пацвярджае неабходнасць школьнай рэформы, прымушае задумацца, ці ўсё добра ў падрыхтоўцы кадраў настаўнікаў. Ці заўсёды слова «настаўнік» зліта арганічна са словам «інтэлігент».

Л. СІДАРАВА.

Новыя старонка Ленініяны

У ТВОРЧАСЦІ ПАЎЛА ІВАНАВІЧА ТКАЧОВА ЛЕНІНСКАЯ ТЭМА — АСНОЎНАЯ. ЮНЫМ ЧЫТАЧАМ ВЯДОМЫ ЯГО КНІГІ ПРА ЛЕНІНА: «ВІШНЁВАЯ КВЕЦЕНЬ», «СЭРЦА КАМУНАРА», «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ», «НА ШУШЫ, ЛЯ ПАДНОЖЖА САЯНАЎ» І ІНШ. У 1982 ГОДЗЕ ВЫЙШЛА ЯГО КНІГА «ЯК РАЗГАРАЛАСЯ ПОЛЫМЯ».

Шматлікія фотаздымкі (сярод іх нямала рэдкіх), рэпрадукцыі з карцін («Ленін сярод сялян Шушанскага» Басава, «Ленін на паляванні» Сідарава і інш.), копіі ленінскіх аўтографаў, дакументаў, газет, кніг — усё гэта дапаўняе змест кнігі, дае магчымасць лепш перадаць эпоху.

«Як разгаралася полымя» — кніга-падарожжа. Разам з аўтарам чытачы наведваюць Ульянаўск, Казань, Самару, Маскву, Ленінград, Германію, Італію і г. д., праходзяць дарогамі ленінскага жыцця, дарогай гісторыі. Кніга чытаецца лёгка, старонкі жыцця Ільіча падаюцца ў яркіх апісаннях, дыялогах, дзённіках, запісах, успамінах.

Пісьменнік грунтоўна ўвайшоў у тэму, вывучыў і прааналізаваў вялікі гістарычны і архіўны матэрыял, перачытаў Леніна. Не адзін дзень, напрыклад, прасядзеў ён у дзяржаўным архіве Краснаярскага краю, каб сказаць нешта новае пра знаходжанне Леніна ў Шушанскім.

Мастакі даўно адзначылі: каб напісаць Леніна, трэба для гэтага яго кожны раз зноў АДКРЫВАЦЬ. Гэтым шляхам ідзе П. Ткачоў. Яго аповесць «Як разгаралася полымя» узбагаціла беларускую Ленініяну. Не сумняваюся, што гэтая кніга будзе перакладзена на іншыя мовы і ўсюды знойдзе чытачоў. У ёй перададзена хвалюючая праўда рэвалюцыі, створаны вобраз Леніна — натхнёнага змагара-рэвалюцыянера, мудрага правадыра народных мас, самаадданага камуніста, чалавека магутнага інтэлекту, маштабнага мыслення з той зямной прастатой і абаяльнасцю, што будзе заўсёды прыцягваць да сябе людзей розных краін і часоў. Кніга П. Ткачова дае юным урокі вялікага жыцця, адказвае на пытанне: з каго рабіць жыццё?

П. СУХАНАВА.

БОЛЬ І СПОВЕДЗЬ

НЕ ЗНІКНЕ НІКОЛІ ПАМЯЦЬ, ШТО ПАКІНУЛА ПАСЛЯ СЯБЕ ВАЙНА — ГЭТАЯ ДУМКА ГАЛОЎНАЯ Ў ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ АПОВЕСЦІ СЯРГЕЯ ПАНІЗНІКА «БРАНІСЛАВА» (ВЫД. «ЮНАЦТВА», 1985). ЯНА НАПІСАНА Ў ФОРМЕ СВОЕАСАБЛІВАГА ДЫЯЛОГУ АЎТАРА І БРАНІСЛАВЫ, ЧАЛАВЕКА, У ЯКОГА ВАЙНА АДНЯЛА ЎСЁ: МАЦІ, БАЦЬКУ, ВЁСКУ, ДЗЕ ЯНА НАРАДЗІЛАСЯ, І НАВАТ ПАМЯЦЬ... «МАЕ НЯШЧАСЦЕ Ў ТЫМ, ШТО Я НЕ МАГУ ЎСПОМНІЦЬ,— ГАВОРЫЦЬ БРАНІСЛАВА.— СІЛЮСЯ НЕШТА ЎСПОМНІЦЬ — А Ў ГАЛАВЕ ТАДЫ НІБЫ ПОЛЫМЯ ПАЧЫНАЕ ШУГАЦЬ. ВАРТА ЎСПОМНІЦЬ ВАЙНУ — ЖАР ДА СЭРЦА ПАДСТУПАЕ, МЛОСНА РОБІЦЦА...»

СЯРГЕЙ ПАНІЗНІК нарадзіўся пазней за Браніславу, пасля сорак першага. І яго дзяцінства было цяжкім, таму яму лягчэй за ўсё зразумець. Ён адчувае ўсвядомленую блізкасць да тых, хто нарадзіўся раней, на чыю долю выпала «смерць у растэрміноўку» ў Асвенціме, Равенсбруку, Дахау, Саласпілсе.

«...Я буду шукаць тваю памяць...» — абяцае аўтар Браніславе. І ён прайшоў шмат дарог, збіраючы старонкі «вялікай памяці» народнай.

«Браніслава» успрымаецца як працяг кнігі-дакумента «Я з вогненнай вёскі», запісанай А. Адамовічам, Я. Брылём, І. Калеснікам. С. Панізнік сам піша пра гэта: «...я стараўся як мага больш даведацца: а што было пасля вогненных вёсак». Але ён апавядае і пра тыя трагічныя моманты, калі фашысцкія нелюдзі знішчалі цэлыя раёны, палілі іх разам з жыхарамі, як узнімалі на штыках на вачах матак і кідалі ў агонь малых дзетак...

Значнае месца адведзена ў аповесці паказу дружбы народаў нашай шматнацыянальнай краіны, у прыватнасці беларускага і латышскага. Поплеч змагаліся яны супраць нямецкіх захопнікаў. Беларускія жанчыны пяклі хлеб латышскім партызанам, латышы давалі прытулак дзецям беларусаў, хавалі, ратавалі іх ад ворагаў, не давалі вывозіць у рабства. Лёсы двух народаў-суседзяў цесна перапляліся. «Сёння на кожнай рыжскай вуліцы можна сустрэць землякоў»,— піша аўтар.

«Браніслава» С. Панізніка — дакументальная аповесць. Але хоць ёсць у кнізе пэўны сюжэт, твор гэты больш нагадвае зборнік дакументаў і ўспамінаў.

Усім зместам сваім кніга накіравана супраць вайны, і ў сённяшняй трывожнай абстаноўцы тэрмаядзернай пагрозы яна з'яўляецца ўсхваляваным словам у абарону міру на планеце.

Д. НЯХАЙ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
26 сакавіка 1987 года.
Зак. 1575

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ.